УДК 37(476)(092)+929 Бельскі

***А.І. Бельскі***
(Мінск)

# НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ Ф. А. БЕЛЬСКАГА: ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНАЯ ПАРАДЫГМА

*В статье автор выделяет практико-ориентированную парадигму как основополагающую в научно-педагогической деятельности Ф. А. Бельского. Особое внимание уделено таким формам обучения, как самостоятельная работа студентов, исследовательская работа в научных кружках, педагогическая практика. Отмечается актуальность научного наследия ученого-педагога в связи с тенденциями в сфере современного образования.*

**Ключевые слова:** практико-ориентированный подход, Ф.А. Бельский, педагог, обучение, образование, методы, формы, самостоятельная работа, педагогическая практика, профессиональная подготовка, самообразование, саморазвитие.

*The author on the article identifies the practice-oriented paradigm as fundamental in the scientific and pedagogical activity of F. A. Belsky. Special attention is paid to such forms of education as students' independent work, research clubs' academic activities, and pedagogical internship. The paper also discusses the teacher-scientist's research heritage and its relevance in the context of the current trends in modern education.*

**Keywords:** practice-oriented approach, F. A. Belsky, teacher, training, education, methods, forms, independent work, pedagogical internship, vocational training, self-education, self-development.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Самарэалізацыя асобы, развіццёвая накіраванасць навучання – трэнд у сусветнай адукацыі [2; 13; 16]. На сучасным этапе навучання ва ўстановах вышэйшай адукацыі актуалізаваны практыка-арыентаваны падыход, накіраваны на фарміраванне прафесійных кампетэнцый будучых спецыялістаў [3; 4; 10; 11; 14], прытым асаблівая роля і значэнне надаецца разнастайным метадам і інавацыйным тэхналогіям [15; 17], арганізацыі эўрыстычнай дзейнасці [19].

Вылучаючы практыка-арыентаваную парадыгму як эфектыўную, прыярытэтную, найбольш перспектыўную, варта зрабіць хаця б сціслы экскурс у гісторыю педагогікі і адукацыі, каб пераканацца, што падрыхтоўка спецыяліста высокага ўзроўню, здольнага паспяхова і плённа весці прафесійную дзейнасць, была заўсёды важнай, першачарговай задачай у сістэме дзейнасці вышэйшай школы. У заходнееўрапейскіх універсітэтах XIX–XX стст. значная ўвага надавалася эксперыментальным даследаванням, самастойнай працы, якая вялася на практычных семінарах, у лабараторыях, пры гэтым прафесар выступаў як кіраўнік даследчай і самастойнай дзейнасці студэнтаў. Сувязь, сінтэз тэорыі і практыкі – асноўная, вызначальная тэндэнцыя развіцця псіхолага-педагагічнай навукі. На нямецкую эксперыментальную педагогіку і псіхалогію канца XIX–XX ст. арыентаваліся многія вучоныя Расійскай імперыі, якія мелі на мэце выпрацаваць метадалагічныя асновы станаўлення школы і адукацыі на новым гістарычным этапе. У 1920-я гг. да перадавога, інавацыйнага заходнееўрапейскага вопыту падключыліся савецкія вучоныя-педагогі. Сярод іх быў прафесар Фама Антонавіч Бельскі (1890–1952), які ў значнай ступені сканцэнтраваў сваю ўвагу на дасягненнях і набытках замежнай эксперыментальнай педагогікі і псіхалогіі, звяртаўся да наватарскіх ідэй і поглядаў В. А. Лая, Э. Меймана, П. Натарпа, Ж. Кампайрэ, С. Хола, В. Вунта, М. Мантэсоры і інш. [1, с. 4–8]. Ф. А. Бельскі, арыентуючыся на папярэднікаў і ўлічваючы назапашаны навуковы досвед, распрацоўваў тэарэтыка-метадагічныя і практыка-арыентаваныя аспекты педагогікі, ён надаваў важнасць вопытна-эксперыментальнай працы пры правядзенні педагагічных даследаванняў, прытрымліваўся прынцыпу практычнай накіраванасці навучання, прапаноўваў сваё мадэльнае бачанне сістэмы навучання таленавітых, адораных дзяцей, падрыхтоўкі спецыялістаў педагагічнага профілю і інш.

Навукова-педагагічная дзейнасць Ф. А. Бельскага, яго творчая спадчына ўяўляюць несумненную цікавасць і каштоўнасць пры асэнсаванні новых трэндаў, падыходаў і траекторый, якія вылучаюцца і дамінуюць у сучасны перыяд мадэрнізацыі адукацыі. Уласна кажучы, рэтраспектыўны дыскурс можа ўпэўніць, пераканаць у тым, што гісторыка-педагагічны вопыт мінулага не страціў сваёй актуальнасці і значнасці ў наш час. Нярэдка, як ні парадаксальна, новае – гэта добра забытае старое.

Сучасная дыдактыка разглядае працэс навучання як цэласную сістэму, якая скіравана на развіццё асобаснага патэнцыялу [2; 12]. Пагодзімся, «мэтай



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

працэсу прафесійнага самаразвіцця з'яўляецца развіццё здольнасцей да самапазнання; пошук сродкаў, якія дапамагаюць студэнту ў самаразвіцці – самавызначэнні і самарэалізацыі» [17, с. 72]. Аднак заўсёды, які перыяд развіцця адукацыі мы ні ўзялі б, вельмі важна было абудзіць у студэнта жаданне вучыцца, авалодваць ведамі, імкненне да пастаяннага самаразвіцця, творчага самавыяўлення, маральна-культурнага росту, спраўдзіць сябе ў абраным родзе дзейнасці, дасягнуць прафесійных вышынь. Практычная дзейнасць – адзін з вызначальных фактараў матывацыі і стымулаў для прафесійна-педагагічнага станаўлення будучага настаўніка ці выкладчыка. Агульнавядома: тэорыя правяраецца практыкай. Інакш кажучы, атрыманыя веды павінны знайсці практычнае прымяненне і выкарыстанне. «Працэс прафесійнага самаразвіцця» акурат і прадугледжвае арганізацыю дзейнасці студэнтаў па практычным авалоданні кампетэнцыямі, уменнямі прафесійнага і творчага характару.

На думку Ф. А. Бельскага, адным з сістэмаўтваральных фактараў пры падрыхтоўцы спецыяліста з'яўляецца самастойная і даследчая праца. Сам педагог-практык, ён клапаціўся пра тое, як наладзіць эфектыўны працэс навучання студэнтаў і кіраўніцтва іх дзейнасцю, пра што могуць красамоўна пасведчыць назвы яго артыкулаў «Педагагічная кансультацыя» (1925), «Арганізацыя семінараў павышанага тыпу» (1927), «Нарматыўныя элементы педагогікі пры выкладанні яе ў педвну» (1929), «Арганізацыя падрыхтоўкі да заліковай сесіі» (1935) і інш. З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны Ф. А. Бельскі – у эвакуацыі, апынуўся ва Узбекістане, узначаліў кафедру педагогікі Бухарскага педінстытута. Дарэчы, да гэтага ён працаваў у Чарнігаўскім педінстытуце, дзе стаў арганізатарам і першым загадчыкам кафедры педагогікі. На пасяджэнні Савета Бухарскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута ад 26 лістапада 1941 года быў вынесены на абмеркаванне даклад Ф. А. Бельскага «Метады самастойнай работы студэнтаў». Выступаючы, ён адзначыў, што «самастойная праца студэнтаў мае вялікае значэнне ў замацаванні трывалых і грунтоўных ведаў. Неабходна культываваць розныя віды самастойнай работы студэнтаў, пачынаючы ад больш простых… і заканчваючы творчымі навуковымі працамі (III–IV к.). Кожнаму выкладчыку ў рабочым плане дысцыпліны, якую ён выкладае, таксама неабходна вызначыць маштаб самастойнай працы над першакрыніцамі, рэкамендаванай літаратурай і кантраляваць іх прапрацоўку ў час кансультацый. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на стымуляванне розных відаў самастойнай працы ў навуковых гуртках» [5]. У дакладзе «Аб выкананні мерапрыемстваў па ўзмацненні самастойнай работы студэнтаў», агучаным на пасяджэнні Савета інстытута ад 27 лістапада 1943 г., Ф. А. Бельскі адзін з асноўных акцэнтаў зрабіў на тым, што для «самастойных дамашніх работ неабходна прадугледжваць такія заданні, якія мелі б элементы даследчага характару з унясеннем індывідуальных думак і заўваг» [6]. Ф. А. Бельскі, маючы значны вопыт у арганізацыі даследчай працы, стварыў навуковы



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гурток па педагогіцы, у які ён запрашаў найбольш здольных студэнтаў. План работы навуковага гуртка на II семестр 1945/46 навучальнага года перш за ўсё прадугледжваў заслухоўванне і абмеркаванне дакладаў на актуальныя навуковыя тэмы, якія распрацоўвалі студэнты розных курсаў. Кіраўнік гуртка арыентаваў на тэарэтычны падыход да вырашэння той ці іншай педагагічнай праблемы, на самастойнае выкананне даследавання, даваў рэкамендацыі па вядзенні навуковага пошуку і да т. п. Ён уключаў студэнтаў у педагагічную навуку на павышаным, паглыбленым узроўні, даючы ўяўленне пра яе напрамкі і задачы, імкнуўся паўплываць на матывацыю даследчай дзейнасці членаў гуртка з мэтай рэалізацыі іх творчага патэнцыялу. Нароўні са студэнтамі прафесар сам выступаў з навуковымі дакладамі. На ўласным прыкладзе ён дэманстраваў узор структуравання навуковага тэксту, публічнай прэзентацыі навуковых вынікаў. На пасяджэннях кафедры педагогікі яе загадчык неаднаразова акцэнтаваў увагу на неабходнасці павышэння якасці і ўзроўню навукова-даследчай працы.

Працуючы ў пасляваенны час у Ленінградскім абласным настаўніцкім інстытуце, Ф. А. Бельскі ў аснову асобасна-арыентаванага развіцця і прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў паклаў даследчы падыход. Дастаткова сказаць, што на працягу 1947–1949 гг. пад яго кіраўніцтвам працаваў навуковы студэнцкі гурток, на пасяджэннях якога было заслухана і абмеркавана больш як 30 дакладаў і рэфератаў. Стварэнне Ф. А. Бельскім навуковых гурткоў у розных навучальных установах сведчыць пра тое, што ён выдатна ўсведамляў значэнне педагагічнай дзейнасці па развіцці адоранасці, творчых здольнасцей студэнцкай моладзі.

У сістэме прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў Ф. А. Бельскі заўсёды адводзіў надзвычай важнае, нават прыярытэтнае месца арганізацыі і правядзенню педагагічнай практыкі. Ён усведамляў важнасць авалодання методыкай навучання, практычнымі ўменнямі і навыкамі на этапе аўдыторнай працы. Наколькі сур’ёзна, прынцыпова і патрабавальна Фама Антонавіч ставіўся да прафесійнай падрыхтоўкі і кампетэнтнасці студэнтаў, якія ідуць на практыку, сведчыць наступны запіс у пратаколе пасяджэння праўлення Данецкага інстытута народнай адукацыі ад 8 студзеня 1929 г.: «У асноўным форма педпрактыкуму была прызнана правільнай усімі, хто выказаўся, акрамя праф. Бельскага, які лічыць немагчымым дапускаць недастаткова ўзброеных студэнтаў да правядзення заняткаў» [7]. Праз некаторы час Ф. А. Бельскі напісаў і надрукаваў артыкул «Педагагічная практыка студэнцтва і методыка яе ажыццяўлення» (1931).

Цікавы і паказальны факт: у гады Вялікай Айчыннай вайны першачарговае значэнне набывала правядзенне вучэбна-вытворчых практык, накіраваных на інтэнсіфікацыю ў справе падрыхтоўкі прафесійных кадраў. Педагагічныя вну не сталі выключэннем. На пасяджэнні Савета Бухарскага педагагічнага інстытута 2 лістапада 1941 г. быў вылучаны адзін з галоўных кірункаў дзейнасці ва ўмовах ваеннага часу: «Зацвярджэнне плана правядзення педпрактыкі на



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

1941–1942 нав. г.». Вынікам правядзення педпрактыкі была прысвечана сумесная нарада пры дырэкцыі Бухарскага педагагічнага (настаўніцкага) інстытута з прадстаўнікамі Наркамасветы УзССР, аблана і прадстаўнікамі ад школьных навучальных устаноў. У пратаколе адзначаецца, што «члены кафедры кантралявалі працу кіраўнікоў педпрактыкі – праф. Бельскі наведваў рускія групы, Шырбаеў – узбекскія групы» [8]. На нарадзе адзначалася: «Педагагічная практыка – гэта люстэрка, якое сведчыць аб працы інстытута, паказвае метадычную аснашчанасць інстытута» [8]. Асноўная ўвага была засяроджана на падрыхтоўцы будучых настаўнікаў – нацыянальных кадраў, абмеркаваны метадычны ўзровень, якасць праведзеных заняткаў, а таксама закрануты шэраг важных праблем. Прафесар Бельскі станоўча ацэньваў дзейнасць выкладчыкаў і студэнтаў у перыяд педпрактыкі і разам з тым выказваў крытычныя меркаванні.

У наступныя ваенныя гады ў Бухарскім педагагічным інстытуце вядучая роля па-ранейшаму надавалася педагагічнай і метадычнай падрыхтоўцы студэнтаў да праходжання вучэбнай практыкі ў школе. Педагагічная практыка разглядалася як асноваўтваральнае звяно ў сістэме дзейнасці вну. У сувязі з гэтым асаблівая роля і адказнасць ускладалася на кафедру педагогікі і яе загадчыка Ф. А. Бельскага. Ён узяў на сябе агульнае кіраўніцтва інстытуцкай педагагічнай практыкай, прыкладаў усе намаганні для таго, каб палепшыць, удасканаліць практыка-арыентаванае навучанне, стварыць неабходныя ўмовы на школьных пляцоўках для плённай і якаснай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў. Загадчык кафедры аказваў «дапамогу агульнаметадычнага і педагагічнага характару студэнтам-практыкантам і кіраўнікам-метадыстам» [9]. Пра гэта сведчаць пратаколы пасяджэнняў саветаў інстытута і справаздачы кафедры. Ф. А. Бельскі выступаў з дакладамі, у якіх аналізаваў узровень і якасць практычнай падрыхтоўкі студэнтаў да працы ў школе, адзначаў станоўчыя і адмоўныя моманты, рабіў высновы і канкрэтныя прапановы. Пытанне аб педагагічнай практыцы студэнтаў чацвёртых курсаў заслухоўвалася на пасяджэнні Савета Бухарскага педагагічнага інстытута 29 студзеня 1944 г. У справаздачы Ф. А. Бельскі адзначыў, што «падрыхтоўка да правядзення практыкі і арганізацыя яе ў бягучым навучальным годзе характарызуецца пэўным паляпшэннем у параўнанні з папярэднім годам» [9]. 28 мая 1945 г. адбылося пашыранае пасяджэнне з удзелам усіх кіраўнікоў педагагічнай практыкі, дэканаў факультэтаў, загадчыкаў кафедраў, дырэктараў сярэдніх школ Бухары, дзе праводзілася практыка. На Савеце інстытута 6 чэрвеня гэтага ж года Ф. А. Бельскі выступіў са справаздачай у выглядзе грунтоўнага аналітычнага даклада. Такім чынам, у дзейнасці Бухарскага педагагічнага інстытута ваеннага перыяду педагагічная практыка стала адной з асноўных, вызначальных частак вучэбнага працэсу. Ф. А. Бельскі разглядаў педпрактыку як надзвычай важны і адказны этап падрыхтоўкі студэнтаў да настаўніцкай прафесіі, фарміравання іх кампетэнтнасці, належнай педагагічнай культуры.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Трэба заўважыць, што Ф. А. Бельскі заўсёды імкнуўся працаваць творча, нестандартна, быў у пастаянным педагагічным пошуку, звяртаўся да практычных метадаў і формаў навучання. У сваёй практыцы 1920-х гг. ён паспяхова выкарыстоўваў такія формы вучэбнай дзейнасці, як педагагічная экскурсія (артыкул «Навукова-педагагічныя экскурсіі Данецкага інстытута народнай адукацыі», 1924), музейныя заняткі (артыкул «Педагагічны музей, яго арганізацыя і культурна-педагагічная дзейнасць», 1926).

У рэчышчы сучаснай педагагічнай парадыгмы актуальнай застаецца думка вучонага аб працэсе няспыннай самадукацыі, прафесійнага росту і культурнага развіцця. Ф. А. Бельскі ў артыкуле «Мэтаімкнёнасць у самаадукацыі настаўніцтва» (1927) зазначаў: «Настаўніцтва заўсёды ставіла для сябе ў працэсе самадукацыі высокую мэту – узняць свой культурны ўзровень на вышэйшую ступень» [18, с. 24]. Ён добра ўсведамляў, што ўнутраная матывацыя, зацікаўленасць і цяга да ведаў, прага творчай самарэалізацыі ў прафесійнай дзейнасці, метадычная кампетэнтнасць і запраграмаванасць на вырашэнне важных і адказных задач – падмурак і запарука якаснай падрыхтоўкі будучага педагога, атрымання ім належнага ўзроўню адукацыі.

Як мы пераконваемся, практыка-арыентаваны падыход прадвызначаў навукова-педагагічную дзейнасць Ф. А. Бельскага пачынаючы з 1920-х гг. і набыў у яго выкладчыцкай працы прыярытэтнасць, сістэматычнасць, характар устойлівай стратэгіі. Інакш кажучы, мэтанакіравана, паслядоўна ён распрацоўваў і ўкараняў канцэпцыю практыка-арыентаванай адукацыі, якая, на яго думку, павінна забяспечыць высокі ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў, здольных паспяхова арганізаваць вучэбны працэс, наладжваць педагагічнае ўзаемадзеянне і камунікацыю.

Сёння ў сістэме нацыянальнай адукацыі адбываюцца працэсы мадэрнізацыі і інтэнсіфікацыі, якія абумовілі пошукі новых канцэптуальных стратэгій, мадэлей, метадаў і тэхналогій навучання. У гэтай сувязі асабліва значэнне набывае прагрэсіўны педагагічны вопыт мінулага, накіраваны на забеспячэнне высокіх узораў і стандартаў адукацыі. Шэраг важных канцэптуальных ідэй, падыходаў у працах і педагагічных даследаваннях Ф. А. Бельскага арганічна ўлучаюцца ў кантэкст трансфармацыйных і інавацыйных тэндэнцый у адукацыйнай сферы нашага часу.

**Літаратура**

1. Бєльський, Ф. Педагогіка як наука (до питання про методологію педагогіки) / Ф. Бєльський. – Луганськ; Донбас, 1929. – 16 с.
2. Бодалев, А. А. Личность и общение / А. А. Бодалев. – Москва : Междунар. психологическая академия, 1995. – 128 с.
3. Вербицкий, А. А. Проблемы проектно-контекстной подготовки специалиста / А. А. Вербицкий // Высш. обр. сегодня. – 2015. – № 4. – С. 2–8.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. Глубокова, Е. Н. Подготовка преподавателя современного вуза к реализации практико-ориентированного образовательного процесса / Е. Н. Глубокова // Человек и образование. – 2016. – № 3. – С. 42 – 47.
5. Дзяржаўны архіў Бухарскай вобласці (ГАБО). – Ф. 532. Воп. 1. Спр. 53. Арк. 50–51.
6. ГАБО. – Ф. 532. Воп. 1. Спр. 71. Арк. 9–10.
7. Дзяржаўны архіў Луганскай вобласці, цяпер – Дзяржархіў ЛНР. – Ф. Р-401. Воп. 1. Спр. 287. Арк. 14.
8. ГАБО. – Ф. 532. Воп. 1. Спр. 53. Арк. 19–20.
9. ГАБО. – Ф. 532. Воп. 1. Спр. 71. Арк. 7–8.
10. Деркач, А. А. Оптимизация личностно-профессионального развития студентов на основе акмеологического потенциала профессиональных дисциплин / А. А. Деркач // Акмеология. – 2014. – № 1–2. – С. 15 – 18.
11. Зимняя, И. Я. Самостоятельная работа как высшая форма учебной деятельности студента / И. Я. Зимняя // Самостоятельная работа студентов: метод. рекомендации преподавателям. – Ленинград : ЛПИ, 1988. – С. 14 – 17.
12. Кириллова, Г. Д. Процесс развивающего обучения как целостная система / Г. Д. Кириллова. – Санкт-Петербург : Образование,1996. – 135 с.
13. Кларин, М. В. Инновации в мировой педагогике: обучение на основе исследования, игры и дискуссии: (анализ зарубежного опыта) / М. В. Кларин. – Рига: НПЦ «Эксперимент», 1995. – 176 с.
14. Мамыченко, С. А. Практико-ориентированная модель обучения студентов в учебном процессе современного вуза / С. А. Мамыченко // Бизнес-образование в экономике знаний. – 2017. – № 2. – С. 109–114.
15. Селевко, Г. К. Современные образовательные технологии: учеб. пособ. / Г. К. Селевко. – Москва : Нар. образование, 1998. – 256 с.
16. Смирнова, И. Э. Высшее образование в современном мире: тенденции, стратегии, модели обучения: моногр. / И. Э. Смирнова. – Москва : Перспектива, 2012. – 132 с.
17. Технологии развивающего обучения: сб. науч. тр. / науч. ред. Г. Д. Кириллова. – Санкт-Петербург : Эпиграф, 2002. – 339 с.
18. Фама Антонавіч Бельскі: біягр. матэрыялы і артыкулы = Фома Антонович Бельский: биогр. материалы и статьи / уклад., прадм. і камент. А. І. Бельскага. – Мінск : Выдавец Зміцер Колас, 2015. – 223 с.
19. Хуторской, А. В. Диалогичность как проблема современного образования (философско-методологический аспект) / А. В. Хуторской, А. Д. Король // Вопр. философии. – 2008. – № 4. – С. 109–114.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова